# ЗНАЧЭННЕ ГІСТОРЫКА-ПРАВАВОЙ НАВУКІ Ў КАНТЭКСЦЕ ФАРМІРАВАННЯ І ПАДТРЫМКІ Ў СТУДЭНЦКІМ АСЯРОДДЗІ ГІСТАРЫЧНАЙ ПАМЯЦІ

**Ю. П. Гаўрыльчанка**
*прафесар кафедры фінансавага права і прававога рэгулявання гаспадарчай дзейнасці, доктар юрыдычных навук, прафесар*
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, г. Мінск, Беларусь*

У тэзісах раскрываюцца пытанні эвалюцыі гісторыі дзяржавы і права Беларусі як навукі. Фармулюецца мэта і вызначаюцца этапы развіцця гісторыі дзяржавы і права Беларусі як вучэбнай дысцыпліны. Аўтар падкрэслівае значнасць дадзенай дысцыпліны для фарміравання юрыдычнага мыслення і прававой культуры ў студэнтаў, якія атрымліваюць юрыдычную адукацыю. Адзначаецца выбітны ўклад у развіццё гісторыі дзяржавы і права Беларусі прадстаўнікоў кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права БДУ, асабліва І. А. Юхо, Т. І. Доўнар.

В тезисах раскрываются вопросы эволюции истории государства и права Беларуси как науки. Формулируется цель и определяются этапы развития истории государства и права Беларуси как учебной дисциплины. Автор подчеркивает значимость данной дисциплины для формирования юридического мышления и правовой культуры у студентов, получающих юридическое образование. Отмечается выдающийся вклад в развитие истории государства и права Беларуси представителей кафедры теории и истории государства и права БГУ, особенно И.А.Юхо, Т.И. Довнар.

The theses reveal the evolution of the history of state and law of Belarus as a science. The author formulates the and the stages of development of the history of state and law of Belarus as an academic discipline. The author emphasizes the importance of this discipline for the formation of legal thinking and legal culture among students receiving legal education. The author notes the outstanding contribution to the development of the history of state and law of Belarus representatives of the Department of Theory and History of State and Law of BSU, especially J.Yuho, T.Dovnar.

У сацыяльным механізме функцыяніравання гістарычнай памяці народа сярод яго галоўных інстытутаў (сям’я, грамадскія аб’яднанні, палітычныя партыі, сродкі масавай інфармацыі, рэлігія і інш.) важнае месца належыць адукацыі. Развіццё беларускай юрыдычнай адукацыі непасрэдна звязана з адкрыццём у 1921 г. Беларускага дзяржаўнага універсітэта. З моманту яго заснавання на працягу дзесяцігоддзяў мяняліся вучэбныя планы, удакладняліся, адаптаваліся, прыстасоўваліся да новых умоў жыцця вучэбныя праграмы, уводзіліся новыя вучэбныя курсы і інш. Аднак галоўная задача заўседы заставалася: забяспечыць падрыхтоўку годных прафесіяналаў, патрыётаў сваёй Айчыны.

Упершыню на юрыдычным факультэце БДУ курс «Гісторыя дзяржавы і права Беларусі» быў уведзены у 1964 г. З гэтага часу вучэбны прадмет з'яўляецца адной з фундаментальных юрыдычных дысцыплін, якая вывучаецца ва ўсіх сярэдніх і вышэйшых навучальных установах Беларусі. Прадметам вывучэння гэтай вучэбнай дысцыпліны, які доўгі час чытаў Язэп (Іосіф) Аляксандравіч Юхо, з'яўляецца сістэма ведаў аб узнікненні і эвалюцыі беларускай дзяржаўнасці, найбольш важных этапах, тэндэнцыях і асаблівасцях гістарычнага развіцця дзяржавы і права Беларусі.

Як вучэбная дысцыпліна, «Гісторыя дзяржавы і права Беларусі» мае галоўнай мэтай наданне ведаў студэнтам аб канцэптуальных асновах, храналагічнай паслядоўнасці і асноўных этапах развіцця беларускай дзяржаўнасці і прававой сістэмы; іх асаблівасцях і характэрных рысах; эвалюцыі важнейшых прававых інстытутаў і галін права; дасягненнях прававой культуры Беларусі [1, с. 3]. Пры засваенні курса студэнты перш за ўсё павінны азнаёміцца з асноўнымі помнікамі айчыннага права; звярнуць увагу на асаблівасці функцыянавання і гістарычнага развіцця дзяржаўных органаў, судовай сістэмы, заканадаўства на розных гістарычных этапах развіцця беларускай дзяржаўнасці, а таксама на праблемныя і дыскусійныя пытанні айчыннай гісторыі дзяржавы і права. Пры гэтым вельмі важным у адукацыйным працэсе з'яўляецца і выхаваўчая мэта. Менавіта вывучэнне гісторыі развіцця дзяржавы і права Беларусі значна садзейнічае гэтай мэце.

Шматлікія гістарычныя прыклады ўплыву айчынных мысліцеляў і дзяржаўных дзеячоў на нарматворчы працэс і ўвогуле на прагрэсіўнае развіцце дзяржаўна-прававых інстытутаў, служаць для студэнтаў арыенцірам у сваёй будучай прафесійнай дзейнасці. На гэта ўплывае і асабісты прыклад прафесарска-выкладчыцкага складу кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права, якія не толькі выкладаюць студэнтам неабходныя дысцыпліны, але займаюцца навуковай дзейнасцю і даследуюць шматлікія праблемныя пытанні айчыннай гісторыі. Выкладчыкі на лекцыях і семінарах акцэнтуюць увагу на значэнні вывучэння мінулай гісторыі, распрацоўваюць неабходныя для студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў па юрыдычных спецыяльнасцях тыповыя вучэбныя праграмы, планы семінарскіх заняткаў, тэматыку курсавых, дыпломных і навуковых работ, а таксама вучэбныя і вучэбна-метадычныя дапаможнікі і падручнікі.

У гэтым кантэксце неабходна падкрэсліць асаблівую заслугу доктара юрыдычных навук, прафесара Юхо. Я.А. Менавіта ён пачаў актуалізіраваць пытанні айчыннай гісторыі, пісаў першыя вучэбныя

праграмы і шматлікія навучальныя дапаможнікі па гісторыі дзяржавы і права Беларусі, якія і зараз з цікавасцю ўспрымаюцца студэнтамі [2].

Патрэбна адзначыць, што вучэбная дысцыпліна грунтуецца на дасягненнях навукі гісторыі дзяржавы і права Беларусі, якая не толькі дае агульнае ўяўленне аб стане, характэрных рысах і тэндэнцыях развіцця айчыннай дзяржавы і яе права, але перш за ўсё дае магчымасць асэнсаваць узровень развіцця беларускай дзяржаўнасці і яе прававой культуры на тым ці іншым гістарычным этапе, выявіць месца асобы ў грамадстве і ролю народа ў гістарычным працэсе [1, с.3]. Увогуле ўся прававая навука арганічна звязана з дзяржаўнай арганізацыяй грамадства і адначасова з'яўляецца як прадуктам развіцця грамадства, так і адным з вызначальных фактараў належнай яго арганізацыі. Менавіта таму на працягу стагоддзяў навукоўцы займаліся аналізам гісторыка-прававога развіцця чалавечай цывілізацыі і пошукам спосабаў найбольш эфектыўнага функцыянавання дзяржавы і права. [1, с.3]. Даследаванне прававой спадчыны беларускага народа, якое даволі доўга стрымлівалася шэрагам фактараў, дае нам уяўленне не толькі аб асаблівасцях дзяржаўна-прававога развіцця на тым ці іншым гістарычным этапе, але і ўзроўні прававой культуры тагачаснага грамадства.

Па розных прычынах айчынныя навукоўцы доўгі час не надавалі ўвагі гісторыі дзяржавы і права Беларусі. Пераважна замежныя даследчыкі часам закраналі некаторыя яе аспекты, прычым разглядаліся пытанні даволі суб'ектыўна, з пазіцый развіцця ўласных дзяржаўнасцей. Пры гэтым з-за недастатковасці і супярэчлівасці гістарычных звестак, а таксама выкарыстання навукоўцамі розных найменняў у адносінах да насельніцтва, якое пражывала на беларускіх землях, доўгі час падвяргалася дыскусіям тое, што дзяржаўнасць на тэрыторыі Беларусі мае вельмі старажытнае паходжанне і яе эвалюцыя адбывалася ў рэчышчы агульнаеўрапейскай гісторыі.

Менавіта гэтыя і іншыя праблемныя пытанні айчыннай гісторыі пачаў адразу, у самым пачатку сваёй навуковай дзейнасці закранаць Я. А. Юхо. Яго шматлікія навуковыя публікацыі грунтаваліся на дасягненнях папярэднікаў – працах М.В.Доўнар-Запольскага, У. І. Пічэты і шмат іншых навукоўцаў.

Увогуле айчынная гісторыка-прававая навука зараджалася паступова на падставе мінулых гістарычных даследаванняў, многія з якіх былі даволі недакладнымі. Уклад у яе ўнеслі шматлікія айчынныя і замежныя навукоўцы. Менавіта іх погляды, часам супярэчлівыя і тэндэнцыйныя, сталі падставай для дальнейшых навуковых разважанняў і паступовага стварэння айчыннымі даследчыкамі XIX-XX стст.

канцэпцыі гістарычнага паходжання беларускай дзяржаўнасці і неабходнасці яе ўзнаўлення. Пасля стварэння Беларускай ССР пачала складвацца і савецкая гісторыка-прававая навука Беларусі, для якой былі характэрнымі як пэўныя дасягненні, так і значныя недахопы. Аднак толькі ў канцы XX ст. пачаўся якасны новы перыяд развіцця як беларускай дзяржаўнасці, так і айчыннай навукі гісторыі дзяржавы і права, значны ўклад у які зрабіў Я. А. Юхо. Пры гэтым важным і актуальным стаў нацыянальна-дзяржаўны падыход, пры якім вывучэнне гісторыі ўласнага народа стала прыярытэтным кірункам навуковых даследаванняў [1, с. 20]. На падставе вяртання беларусаў да сваіх вытокаў, усведамлення імі ўласнага гістарычнага шляху навуковыя даследаванні ў сферы гісторыі дзяржавы і права Беларусі актывізаваліся і значна ўзбагаціла айчынную гісторыка-прававую навуку. Несумненнай заслугай Я. І. Юхо стала заснаванне ў БДУ навуковай гісторыка-прававой школы, аб выніках дзейнасці якой і навуковых традыцыях, закладзеных знакамітым навукоўцам гаварылася на канферэнцыі, прысвечанай яго памяці (Мінск, БДУ, 2010).

Нягледзячы на пэўныя дасягненні ў развіцці гісторыка-прававой навукі ў апошнія дзесяцігоддзі, у ёй засталося яшчэ шмат праблемных і мала даследаваных пытанняў. На сучасным этапе выкладчыкі кафедры, пераемна ўспрыняўшы дасягненні гісторыка-прававой навукі і методыку вучэбна-педагагічнай дзейнасці папярэднікаў, пры выкладанні матэрыялу і на семінарскіх занятках пры характарыстыкі гістарычных этапаў айчыннага дзяржаўна-прававога развіцця, акцэнтуюць увага на яго станоўчых і адмоўных рысах, асаблівасцях і тэндэнцыях у паэтапным развіцці дзяржавы і права Беларусі, а таксама звяртаюць ўвагу, са спасылкамі на меркаванні сучасных і папярэдніх навукоўцаў, на праблемныя і спрэчныя пытанні. Пры гэтым, як і прафесар Юхо Я. А., які часам, адхіляючыся ад тэмы, закранаў жыццёвыя пытанні, а таксама пытанні аб мінулай вайне, дзейнасці Льва Талстога і інш., не чураюцца многіх актуальных пытанняў грамадскага жыцця, што, несумненна, носіць станоўчы выхаваўчы характар.

Творчы і наватарскі падыход супрацоўнікаў кафедры праяўляецца ва ўсіх сферах і накірунках яе дзейнасці, у тым ліку ў забеспячэнні вучэбнага працэсу і навуковай дзейнасці. Так, з удзелам і пад кіраўніцтвам прафесара Доўнар Т. І. быў выдадзены шэраг вучэбных і вучэбна-метадычных дапаможнікаў. У 2014 г. Доўнар Т. І. надрукавала першы падручнік па гісторыі дзяржавы і права Беларусі з грыфам Міністэрства адукацыі [1]. Выкладчыкі кафедры працягваюць распрацоўку праблемных пытанняў гістарычнага развіцця дзяржавы і права Беларусі, што служаць падставай для заахвочвання студэнтаў да

навукова-даследчай працы. Пры кафедры працуе студэнцкі навуковы гурток па гісторыі дзяржавы і права Беларусі і інш., удзельнікі якога штогод выступаюць з дакладамі і паведамленнямі на рэспубліканскіх і міжнародных канферэнцыях, прымаюць удзел у алімпіядах і конкурсах студэнцкіх навуковых работ.

На кафедры вядуцца актыўныя навуковыя даследаванні, развіваецца навуковая школа гісторыі дзяржавы і права Беларусі, якую зараз узначальвае прафесар Доўнар Т. І. Пад яе навуковым кіраўніцтвам былі абаронены дысертацыі і падрыхтаваны адзін доктар і дзевяць кандыдытаў юрыдычных навук. Шэраг артыкулаў яна прысвяціла развіццю айчыннай юрыдычнай навукі, у тым ліку і ў Беларускім дзяржаўным універсітэце, дзе паказвае месца юрыдычнай навукі ў сістэме грамадскіх навук, адзначае яе значэнне, навуковыя дасягненні у гэтай сферы, характарызуе ўклад у яе развіццё навукоўцаў юрыдычнага факультэта БДУ [3]. Увогуле творчая спадчына прафесараў Я. А. Юхо і Т. І. Доўнар з’яўляецца тым каштоўным нацыянальным здабыткам, які будзе і ў далейшым садзейнічаць не толькі развіццю айчыннай гісторыка-прававой навукі, але і павагі да мінулых дасягненняў беларускага народа ў сферы права.

Як адзначае прафесар Доўнар Т.І., гісторыка-прававая навука мае асаблівае значэнне, паколькі яна дапамагае прааналізаваць і асэнсаваць папярэдні ход гістарычнага развіцця, улічыць папярэднія дасягненні, выключыць ранейшыя недахопы, а потым на падставе прынцыпу гістарычнай пераемнасці прагназаваць перспектывы далейшага дзяржаўна-прававога і прапаноўваць найбольш прымальныя механізмы яго ўдасканалення. Пры гэтым гістарычны аналіз эвалюцыі айчыннай прававой сферы заўсёды мае галоўнай мэтай - удасканаленне ранейшых і фарміраванне новых прававых інстытутаў і іншых элементаў прававой сістэмы, а таксама больш дасканалага заканадаўства, найболей адэкватнага сучаснай прававой свядомасці. Такі падыход садзейнічае павышэнню эфектыўнасці функцыянавання беларускай дзяржаўнасці як галоўнага на сённяшні момант палітычнага інстытута, які выступае прыладай для дасягнення найлепшага сацыяльна-эканамічнага жыцця грамадзян ва ўмовах усталявання дэмакратычнай сацыяльнай прававой дзяржавы [1, с.4].

Сучасныя патрэбы ў далейшым развіцці гісторыка-прававой навукі звязаны не толькі з тымі прабеламі, што ў ёй засталіся, і з неабходнасцю перагляду шэрагу папярэдніх уяўленняў, а таксама ў сувязі з пастаяннымі трансфармацыямі дзяржаўна-прававой сферы. Пераасэнсаванне папярэдніх гістарычных і тэарэтыка-прававых навуковых падыходаў адносна такіх палітычных інстытутаў як дзяржава

і права садзейнічае ўдасканаленню дзяржаўна-прававой сферы. Тым больш, што менавіта ў гісторыі права найбольш акрэслена адлюстроўваюцца характэрныя рысы сацыяльна-эканамічнага і палітычнага жыцця народа і тыя змены, якія адбываюцца ў сувязі з развіццём і ўскладненнем гістарычнага працэсу. Прафесар Доўнар Т. І. падкрэслівае: "рэканструяванне забытых, але блізкіх прававому менталітэту, прававой свядомасці і прававой культуры беларускага народа дзяржаўна-прававых каштоўнасцей, у тым ліку ідэй, прававых інстытутаў, механізмаў рэгулявання грамадскіх адносін і інш., дапамагае не толькі асэнсаваць і ацаніць узровень мінулай прававой культуры грамадства, але і якасна ўплываць на сучаснае функцыянаванне як асобных прававых з'яў, так і ўсёй прававой сферы ў цэлым" [1, с.4]. Менавіта навуковы аналіз папярэдняга дзяржаўна-прававога вопыту дазваляе звярнуць увагу на тыя недахопы, якія мелі месца ў мінулым і потым у працэсе практычнай дзейнасці іх выпраўляць.

Такім чынам, вывучэнне студэнтамі гісторыі дзяржавы і права Беларусі садзейнічае не толькі сістэмнаму засваенню вучэбнага курса і фарміраванню дакладных ўяўленняў аб храналагічнай паслядоўнасці, этапах і асаблівасцях гістарычнага развіцця беларускай дзяржавы і яе прававой сістэмы, але з'яўляецца важкай падставай для паспяховага засваення студэнтамі іншых юрыдычных дысцыплін і належнай падрыхтоўкі прафесіяналаў у прававой сферы. Акрамя гэтага, засваенне дзяржаўна-прававой гісторыі Беларусі садзейнічае выхаванню іх у духу патрыятызму і павагі да гістарычнага мінулага і дасягненняў продкаў, у тым ліку ў сферы права і заканадаўства. Аднак найбольш важнае ў тым, што набытыя студэнтамі веды гісторыі ўласнага народа дапамагаюць будучым юрыстам стаць сапраўднымі інтэлектуаламі з навуковым светапоглядам і ўласнай грамадзянскай пазіцыяй па складаных пытаннях сучаснага грамадска-палітычнага і дзяржаўна-прававога развіцця.

## БІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ СПАСЫЛКІ

1. Доўнар Т.І. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі : падручнік Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2014. 438 с.
2. Юхо Я.А .Кароткі нарыс нарыс гісторыі дзяржавы і права Беларусі : Вучэб дапам. Мінск : Універсітэцкае, 1992. 270 с.; Гісторыя дзяржавы і права Беларусі : дапаможнік : у 2 ч. Ч. 2. Мінск : РІВШ БДУ, 2003. 275 с . і інш.
3. Доўнар Т.І. Зараджэнне айчыннай гісторыка-прававой навукі і яе развіццё ў Беларускім дзяржаўным універсітэце // Веснік БДУ. Серыя 3. Права, 2010, № 3 .С.3-9; Доўнар Т.І. Дасягненні і недахопы ў развіцці гісторыка-прававой навукі Беларусі // Права.by. № 2 (34). 2015. С.38-45 і інш.